УДК 930:94(47+57)«1941/1945»

**У.В. Здановіч**

# Аб перыядызацыі вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Адной з важнейшых метадалагічных праблем далейшага развіцця гістарычнай навукі аб Вялікай Айчыннай вайне з'яўляецца праблема яе перыядызацыі. Як вядома, навукова абгрунтаваная перыядызацыя дапамагае аб'ектыўна, з улікам гістарычных умоў, прааналізаваць апублікаваную літаратуру і дазваляе адказаць на шэраг істотных пытанняў аб характары і ступені дакладнасці гістарычных распрацовак тэмы на розных этапах яе вывучэння, аб перспектывах далейшага даследавання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Пытанне аб перыядызацыі неаднаразова абмяркоўвалася на навуковых канферэнцыях і ў гістарычнай літаратуры. У ходзе абмеркавання склалася некалькі пунктаў погляду на этапы развіцця даследаванняў па гісторыі вайны. Большасць савецкіх гісторыкаў выдзялялі тры этапы: першы – ваенны (1941–1945 гг.); другі – пасляваенны (1946–1955 гг.); трэці – з сярэдзіны 1950-х гг. да нашых дзён, г.зн. часу напісання той ці іншай працы. Адным з першых трохэтапнае развіццё гістарычных ведаў аб Вялікай Айчыннай вайне прапанаваў А.В. Карасёў, які, у прыватнасці, адзначаў, што «ў развіцці гістарыяграфіі вайны больш ці менш дакладна выдзяляюцца тры перыяды: вайна, ад заканчэння вайны да XX з'езда партыі і ад XX з'езда да сучаснасці» [1].

Такую перыядызацыю падтрымалі П.А. Жылін, Г.А. Куманёў, А.В. Пазняк, А.І. Красюк, Г.Д. Камкоў і іншыя. Падрабязна праблему перыядызацыі разгледзелі М.М. Еўланава і А.В. Мітрафанава, якія выдзелілі шэраг крытэрыяў для вызначэння этапаў развіцця навукі, на падставе чаго вылучылі таксама тры перыяды. Пры гэтым М.М. Еўланава прапанавала падзяліць апошні перыяд на два прамежкавых, мяжой паміж якімі з'яўляецца 1964 г. [2–3].

Іншы пункт гледжання на перыядызацыю вывучэння Вялікай Айчыннай вайны выказалі аўтары гістарыяграфічнага раздзелу ў 6-м томе «Истории Великой Отечественной войны». На падставе аналізу аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў яны прапанавалі разглядаць гістарыяграфію вайны ў рамках двух перыядаў: ад пачатку Вялікай Айчыннай вайны да XX з'езда КПСС і ад XX з'езда да сучаснасці [4].

У аснове разыходжанняў паміж прыхільнікамі трохэтапнага дзялення гістарыяграфіі вайны і прадстаўнікамі двухэтапнага дзялення ляжыць прызнанне перыяду вайны як самастойнага этапу ў развіцці гістарычных ведаў аб Вялікай Айчыннай вайне і ўключэнне 1941–1945 гг. і пасляваеннага дзесяцігоддзя ў адзін перыяд.

Новую перыядызацыю ў 1969 г. прапанаваў М.К. Казыбаеў, які ў доктарскай дысертацыі выказаў меркаванне аб якасна новым этапе гістарыяграфіі вайны, які наступіў пасля кастрычніцкага 1964 г. Пленума ЦК КПСС [5]. Чатырохэтапную перыядызацыю падтрымаў У.Г. Яромін [6].

Некаторыя гісторыкі імкнуліся выдзеліць у асобны перыяд гістарыяграфіі 1970-я гг. Напрыклад, з такой прапановай выступіла Е.Л. Храмкова, аналізуючы літаратуру аб укладзе працоўных Паволжскага рэгіёна ў перамогу над фашызмам. Аднак, у дысертацыі, якая была абаронена на два гады пазней, ёй была прапанавана іншая перыядызацыя: першы этап – 1941–1945 гг.;

другі – другая палова 40-х гг. – першая палова 60-х гг.; трэці этап – другая палова 60-х гг. – першая палова 80-х гг. [7].

Частка даследчыкаў прапанавала некалькі нетрадыцыйны варыянт перыядызацыі асвятлення ваенных падзей. Так, Г.Г. Загваздкін вызначыў наступныя перыяды: першы – сярэдзіна 1940-х – сярэдзіна 1960-х гг.; другі – сярэдзіна 1960-х – сярэдзіна 1980-х гг.; трэці – з 1985 г. [8].

Пачынаючы з канца 1980-х гг., праблема перыядызацыі гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны стала актыўна даследавацца беларускімі гісторыкамі, якія вылучылі новыя падыходы. Так, Я.С. Паўлаў назапашванне гістарыяграфіі аб барацьбе беларускага народа супраць акупантаў падзяліў на тры этапы: з канца 1941 г. да канца вайны; з канца вайны да другой паловы 1960-х гг.; з пачатку 1967 г. да сучаснасці. Трэці этап даследчык пачынае з моманту стварэння ў Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ праблемнай групы па комплексным даследаванні гісторыі ўсенароднай барацьбы ў Беларусі [9].

Я.У. Бараноўскі ў развіцці беларускай ваеннай гістарыяграфіі выдзяляе наступныя этапы: перыяд вайны і першыя пасляваенныя гады: 1953–1964 гг.; 1964–1985 гг.; з 1985 г. па сучасны момант [10].

Аналізуючы ўдзел беларускай моладзі ў Вялікай Айчыннай вайне, А.А. Каваленя вызначае пяць этапаў гістарыяграфіі праблемы: 1941–1944 гг.; 1944 г. – сярэдзіна 1950-х гг.; сярэдзіна 1950-х – сярэдзіна 1960-х гг.; сярэдзіна 1960-х – сярэдзіна 1980-х гг.; другая палова 1980-х гг., уключаючы і 1990-я гг. [11].

Выступаючы на «круглым стале» «Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны: стан і перспектывы даследавання праблемы», А.М. Літвін вылучыў два асноўныя перыяды вывучэння гісторыі Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны: савецкі і сучасны (ці постсавецкі). Першы перыяд – чэрвень 1941 – канец 1991 г.; другі – канец 1991 г. – па сённяшні дзень [12].

Неабходна адзначыць, што дадзеную перыядызацыю падтрымлівае пераважная большасць айчынных гісторыкаў. Разыходжанні існуюць пры вызначэнні этапаў савецкага перыяду.

У прыватнасці, А.М. Літвін падзяляе яго на тры этапы: ваенны (чэрвень 1941 г. – канец вайны); канец 1945 г. – канец 1950-х гг.; канец 1950-х – канец 1991 г. Па сутнасці, даследчык падтрымлівае трохэтапнае дзяленне гістарыяграфіі вайны, вылучанае савецкімі гісторыкамі. Аўтары навукова-папулярнага выдання «Беларусь в годы Великой Отечественной войны» (дарэчы, адным з аўтараў з'яўляецца А.М. Літвін) выступілі ў падтрымку двухэтапнага дзялення.

Такім чынам, навуковыя спрэчкі аб перыядызацыі гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны, якія пачаліся ў 1950-я гг., да гэтага часу не завершаны. У вырашэнне пытання перыядызацыі гістарыяграфічных ведаў аб вайне ўнеслі ўклад многія навукоўцы. Аднак, існаванне шырокага спектру меркаванняў і прапаноў даследчыкаў сведчыць аб тым, што на сучасны момант адзінай перыядызацыі гістарычнай літаратуры па праблемах ваеннай гісторыі не існуе. У сувязі з гэтым і ўлічваючы значнасць пытання лічым неабходным унесці пасільны ўклад у яго вывучэнне.

Адзначым, што на вызначэнне храналагічных рамак этапаў развіцця ведаў аб вайне істотна ўплывае ўзровень развіцця грамадства, ад якога залежыць доступ да крыніц, магчымасць навукоўцаў выказваць свае меркаванне. Акрамя гэтага, на фарміраванне этапаў гістарыяграфіі аказвае ўплыў агульны стан навукі. Вехамі перыядызацыі могуць служыць значныя паваротныя з'явы ў палітычным развіцці грамадства.

На падставе вышэйадзначанага мэтазгодна выдзеліць наступныя перыяды і этапы гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны:

першы перыяд – савецкі (1941 – канец 1991 г.); другі – сучасны (ці постсавецкі): з канца 1991 г. і па сённяшні дзень.

Кожнаму з перыядаў адпавядалі розныя гістарычныя ўмовы, пэўныя задачы, формы і метады арганізацыі навуковых даследаванняў, стан крыніцазнаўчай базы, наяўнасць кадраў даследчыкаў, узровень ведаў фактаў і падзей, з'яў вайны ў дадзены перыяд, своеасаблівыя падыходы да даследаванняў. У сувязі з гэтым літаратура кожнага з этапаў у развіцці гістарыяграфіі адчувае ўплыў таго часу, калі яна стваралася, а таксама адлюстроўвае агульны ўзровень развіцця гістарычнай навукі.

У першым перыядзе можна выдзеліць тры этапы. Першы – ваенны (чэрвень 1941 г. – канец вайны) – пачатак стварэння тэматычнай літаратуры, першыя крокі ў арганізацыі навуковых даследаванняў. Выдзяленне гадоў вайны ў самастойны перыяд, на наш погляд, тлумачыцца наступнымі акалічнасцямі: па-першае, накіраванасць прац мела больш канкрэтны характар, таму што перад даследчыкамі таго часу стаялі іншыя, чым у мірных умовах, задачы; па-другое, гісторыю вайны пісалі непасрэдныя ўдзельнікі падзей; па-трэцяе, вузкая крыніцазнаўчая база не давала магчымасці абагульніць матэрыял і зрабіць фундаментальныя тэарэтычныя высновы.

Працы ваеннага часу неслі адбітак культу асобы Сталіна. Значны ўплыў на гістарыяграфію дадзенага перыяду аказала кніга І.В. Сталіна «О Великой Отечественной войне Советского Союза», у якой былі сфармуляваны першыя ўстаноўкі па тэорыі вывучэння падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Створаныя ў складаных умовах працы, хаця і не з'яўляюцца строга навуковымі творамі, маюць вялікае значэнне таму, што ў іх адлюстравана зараджэнне барацьбы супраць захопнікаў па «гарачых слядах» і перададзены дух таго часу. Важнае значэнне для назапашвання фактаў мела дзейнасць Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пры ЦК КП(б)Б, а таксама дзейнасць Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі па расследаванню злачынстваў нямецкіх акупантаў. На гэтым этапе былі створаны перадумовы для далейшага паглыбленага вывучэння падзей Вялікай Айчыннай вайны, адбывалася складванне канцэпцый іх асвятлення.

Другі этап – пасляваенны (канец 1945 г. – сярэдзіна 1950-х гг.). Гэта этап далейшага назапашваннння дакументальнага матэрыялу, спроб з пазіцый мінулага часу асэнсаваць і абагульніць вопыт барацьбы насельніцтва Беларусі супраць захопнікаў. З пункту гледжання зместу, метадалогіі даследавання другі перыяд адрозніваўся ад першага перыяду пашырэннем гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай базы, дыяпазонам даследуемых праблем, выкарыстаннем у якасці крыніц мемуарнай літаратуры. У той жа час гістарыяграфіі першага і другога перыядаў былі ўласцівы такія агульныя недахопы, як ілюстраваны метад выкарыстання крыніц, вузасць гэтых крыніц, спрошчаная трактоўка гістарычнага працэсу, недастатковая тэарэтычная аснова, перавага апісальнага характару выкладання матэрыялу. У значнай ступені недахопы былі звязаны з недаступнасцю для даследчыкаў шэрагу важнейшых крыніц, а таксама дагматычнымі адносінамі да выказванняў І.В. Сталіна. Ваенная гісторыя стала разглядацца праз прызму «асноватворных ідэй» І.В. Сталіна, што абмяжоўвала асвятленне падзей Вялікай Айчыннай вайны жорсткімі рамкамі, штучнымі схемамі і трактоўкамі.

Аднак, недахопы, якія мелі месца ў гістарыяграфіі дадзенага перыяду, не даюць падстаў ацэньваць яго толькі негатыўна. Спробы асэнсавання і навукова-папулярнай распрацоўкі асобных аспектаў барацьбы насельніцтва Беларусі ў тыле ворага, зробленыя гісторыкамі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, закладвалі фундамент для наступнага паглыбленага вывучэння праблемы.

Трэці этап (другая палова 1950-х гг. – канец 1991 г.) – азначаны колькасным і якасным ростам навуковых даследаванняў па праблемах гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Ён ахоплівае «хрушчоўскую адлігу», «брэжнеўскі застой», «гарбачоўскую перабудову». У гістарычнай навуцы паўстала пытанне аб пераглядзе шэрагу існуючых схем, палажэнняў. Аналіз апублікаванай літаратуры і крыніц паказвае, што многія аспекты гісторыі Беларусі атрымалі грунтоўнае асвятленне, былі падвергнуты крытыцы дагматычныя напластаванні і скажэнні, якія адмоўна адбіліся на навуковай дзейнасці, створаны спрыяльныя ўмовы для далейшага росту навуковых ведаў. Разам з тым, шэраг пытанняў заставаўся па-за полем зроку даследчыкаў. Прычым, сістэма жорстка кантралявала гэты працэс, што садзейнічала стварэнню міфаў аб вайне.

Пасля развалу Савецкага Саюза і набыцця Рэспублікай Беларусь статуса незалежнай і суверэннай дзяржавы ў 1991 г. пачаўся новы перыяд у вывучэнні гісторыі Беларусі часоў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, які мае свае характэрныя рысы.

Значна пашырылася і стала больш рэпрэзентатыўнай крыніцазнаўчая база навуковых даследаванняў. Для даследчыкаў былі адкрыты (хаця і не поўнасцю) фонды Палітбюро і Сакратарыята ЦК ВКП(б), фонды раней закрытых дзяржаўных і ведамасных архіваў, у тым ліку Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства замежных спраў. Гісторыкі пачалі выкарыстоўваць дакументы і матэрыялы архіваў замежных краін, у першую чаргу Германіі і Польшчы. Значную працу за гэты перыяд правялі архівісты рэспублікі, якія падрыхтавалі і апублікавалі шэраг зборнікаў дакументаў і даведнікаў, у тым ліку «Документы по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Республики Беларусь» (1998 г., перавыдадзены ў 2003 г.), «Месцы прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (1996 г., перавыдадзены ў 2002 г. на рускай і нямецкай мовах), «Нацистское золото из Беларуси» (1998 г.), «Холокост в Беларуси» (2002 г.), «Озаричи – лагерь смерти» (1997 г.), «Белорусские остарбайтеры» (1996–1998 гг.), «Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі» (1995 г.), «Мінскае антыфашысцкае падполле» (1995 г.).

Акрамя гэтага пазітыўным момантам стала ўключэнне ў навуковы ўжытак літаратурных, навуковых твораў, перыядычных выданняў, якія былі перададзены з «спецхранаў» у адкрытыя фонды бібліятэк. Даследчыкі атрымалі таксама доступ да раней закрытых прац замежных аўтараў, у першую чаргу, беларускіх эмігрантаў.

Пашырыўся ў колькасных і якасных адносінах кадравы патэнцыял гістарычнай навукі. За 1990–2004 гг. па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны абаронена 30 дысертацый, у тым ліку – 4 доктарскія. «Амаладзіліся» навуковыя кадры гісторыкаў, якія выходзілі на абарону дысертацый.

Характэрнай асаблівасцю новага перыяду беларускай гістарыяграфіі стала з'яўленне побач з традыцыйнымі тэмамі новых накірункаў даследаванняў, якія ў савецкія часы па розных прычынах, у першую чаргу ідэалагічных, заставаліся па-за сферай інтарэсаў даследчыкаў.

Адным з такіх накірункаў з'яўляецца праблема калабарацыянізму. З 22 абароненых у 1995–2004 гг. дысертацый 10 прац, у тым ліку 2 доктарскія, непасрэдна прысвечаны разглядаемай праблеме ці ў значнай ступені закранаюць яе. Гэтаму прысвяцілі свае даследаванні А.А. Каваленя, А.М. Літвін, А.К. Салаўёў, У.Ю. Сервачынскі, У.І. Кузьменка. Некаторыя аспек-

ты калабарацыянізму закранАлі І.А. Валахановіч, С.А. Сільвановіч, К.І. Дамарад, В.В. Барабаш, С.У. Сілава, А.А. Мігунова, Г.А. Болсун, М.Г. Жылінскі, У.І. Кузьменка.

Шэраг прац прысвечаны дзейнасці на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай, антысавецкага падполля. У манаграфічных і кандыдацкіх даследаваннях, асобных артыкулах І.А. Валахановіча, С.У. Жумара, А.М. Літвіна, В.В. Барабаша, Н.А. Рыбак, Я. Сямашкі, В.І. Ермаловіча, У.І. Гуленкі, С.А. Сільвановіча прааналізаваны значны матэрыял, у якім раскрываюцца працэс станаўлення, структура і дзейнасць антысавецкіх падпольных і акаўскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

Нацысцкую палітыку ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі даследавалі Э.Г. Іофе, Л. Смілавіцкі, Я.С. Разенблат, І.Э. Яленская, Г.Дз. Кнацько, Р.А. Чарнаглазава і інш.

Важнай падзеяй у вывучэнні гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны стала з'яўленне гістарыяграфічных і крыніцазнаўчых прац. У пачатку 1990-х гадоў XX ст. дадзеная праблема была прадстаўлена, у асноўным, невялікімі артыкуламі. У 1999 г. убачыла свет самая значная праца беларускіх гісторыкаў «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Зборнік артыкулаў», у якой акцэнтуецца ўвага на найбольш значных пытаннях вывучэння гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Айчынную і польскую гістарыяграфію польскага падполля на тэрыторыі Беларусі ў 1939–1954 гг. прааналізаваў у кандыдацкай дысертацыі С.А. Сіткевіч.

Крыніцазнаўчы аналіз дакументаў справаводства органаў нямецкага акупацыйнага кіравання на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якія знаходзяцца ў фондах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, ажыццявіла І.Э. Яленская.

Гістарыяграфічнаму і крыніцазнаўчаму вывучэнню падзей Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі рэспублікі садзейнічала з'яўленне ў кандыдацкіх і доктарскіх даследаваннях асобнага раздзелу «Гістарыяграфія праблемы і крыніцы».

Адметнай з'явай у асвятленні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стала з'яўленне гісторыка-дакументальных хронік «Памяць». На дадзены момант выдадзены хронікі па ўсіх абласцях і раёнах Беларусі.

Да характэрных рыс новага перыяду неабходна таксама аднесці з'яўленне спецыялізаваных часопісаў: «Беларускі гістарычны часопіс», «Спадчына», «Беларуская думка», «Беларуская мінуўшчына» і інш. Практычна ва ўсіх універсітэтах выдаюцца «Веснікі». Такія перыядычныя выданні, па-першае, даюць магчымасць даследчыкам апублікаваць свае працы, па-другое, знаёмяць шырокае кола грамадскасці з навейшымі дасягненнямі навукоўцаў у вывучэнні праблем Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Аб творчым уздыме айчыннай гістарычнай навукі на сучасным этапе сведчыць і той факт, што па розных аспектах гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны праведзены дзесяткі навуковых канферэнцый рознага ўзроўню, у тым ліку міжнароднага, тэматыка якіх не толькі адлюстравала разнастайны спектр даследчыцкіх пошукаў навукоўцаў Беларусі, але і акрэсліла новыя актуальныя праблемы.

Прымаючы за аснову дадзеную перыядызацыю неабходна адзначыць, што не заўсёды з празмернай дакладнасцю можна фіксаваць межы перыядаў.

У некаторых выпадках дакладнае ўказанне нават года можа аказацца занадта вузкай храналагічнай мяжой. На наш погляд, мэтазгодна ўжываць у такіх выпадках больш працяглы прамежак часу, які падзяляе асобныя этапы гістарыяграфіі.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Карасёв А.В.*** Краткий обзор литературы по истории Великой Отечественной войны // Вопросы истории, 1961, № 6. – С. 30.
2. ***Евланова М.Н.*** Историография борьбы Коммунистической партии за создание социально-экономических условий победы Советского Союза в Великой Отечественной войне. 1941–1945 гг.: Автореф. дис. ...докт. ист. наук. – М., 1983.
3. ***Митрофанова А.В.*** Об основных этапах советской историографии Великой Отечественной войны / Историография советского тыла в периоды Великой Отечественной войны. – М., 1976. – 442 с.
4. ***История Великой Отечественной войны Советского Союза***. 1941–1945: в 6 т. – Т. 6. – М., 1965. – С. 403.
5. ***Козыбаев М.К.*** Коммунистическая партия Казахстана в период Великой Отечественной войны Советского Союза (1941–1945 гг.): Автореф. дис. ...докт. ист. наук. – Алма-Ата, 1969. – С. 13.
6. ***Ерёмин В.Г.*** Некоторые вопросы деятельности комсомола как боевого помощника партии в советском тылу в годы Великой Отечественной войны // Вопросы истории КПСС, 1980, № 5. – С. 62.
7. ***Храмкова Е.Л.*** Вклад трудящихся Поволжья в победу советского народа в Великой Отечественной войне (Советская историография 1941–1986 гг.): Автореф. дис. ...канд. ист. наук. – Казань, 1987. – С. 6.
8. ***Загвоздкин Г.Г.*** Социальная политика ВКП(б) и Советского государства в годы Великой Отечественной войны: Автореф. дис. ...докт. ист. наук. – Л., 1991. – С. 11.
9. ***Павлов Я.С.*** Проблема борьбы советского народа с фашистской агрессией в начале войны в трудах белорусских историков // 1941 год: трагическое и героическое. Тезисы межреспубликанской научной конференции, посвященной 50-летию начала Великой Отечественной войны. 19–21 июня 1991 г. – Мн., 1991. – С. 8.
10. ***Мужество и трагедия народа:*** По материалам «круглого стола», посвященного 55-летию Победы в Великой Отечественной войне / Отв. ред.: ***Р.П. Платонов, В.В. Федосов***. – Мн., 2000. – 72 с.
11. ***Каваленя А.А.*** Моладзь Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства: Зб. артыкулаў. – Мн., 1999. – С. 153–154.
12. ***Літвін А.М.*** Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны: стан гістарыяграфіі і перспектывы далейшага даследавання праблемы // Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны: стан і перспектывы даследавання праблемы: Матэрыялы «круглага стала» / Рэдкал.: ***А.А. Каваленя, А.М. Літвін*** (адк. рэд.) і інш. – Мн., 2005. – С. 9.



## SUMMARY

*Different views on the stage development of the Great Patriotic War history are considered in the article. It is mentioned that a wide range of views and assumptions on the given problem have been presented by researchers. At present there is no single approach to the period study of the Great Patriotic War history. The author suggests his variant of the study.*


*Поступила в редакцию 13.03.2006*